1941-1945

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці

прадстаўляе дакументальны праект

# АРЛЯНЯТЫ

“Мільёны дзіцячых жыццяў у пякельным полымі вайны”

Выстава прымеркавана да гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Экспазіцыя прадстаўлена матэрыяламі і тэкстамі артыкулаў пра юных патрыётаў Віцебшчыны, апублікаваных на старонках газеты «Віцебскі рабочы» ў 1975, 1977 і 1978 гг.

# Партнова Зіна

Ленінградская школьніца, Зіна Партнова, якая скончыла сем класаў, прыехала на летнія канікулы да сваёй бабулі ў вёску Зуі Шумілінскага раёна. Тут, летам 1941 г., дзяўчынку застала вайна.

Новыя парадкі, якія завялі акупанты, і эксплуатацыя мясцовага насельніцтва нікому не падабаліся. Тыя, хто адмаўляўся цярпець бясчынствы, сталі аб'ядноўвацца ў атрады, арганізуючы партызанскае падполле. У іх шэрагі трапіла і юная Зіна.

Яшчэ да пачатку вайны адважная піянерка сябравала з Фрузай Зяньковай, удзельніцай камсамольскага падполля. Менавіта яна і прыцягнула малодшую сяброўку да спраў партызанскага атрада "Юныя мсціўцы". Дзяўчынка разам з аднагодкамі расклейвала антыфашысцкія лістоўкі і змагалася з ненавісным рэжымам: выводзіла са строю нямецкую тэхніку, спальвала склады з боепрыпасамі і узбраеннем.

Па заданні падпольнай арганізацыі юная партызанка ўладкавалася падсобнай работніцай на афіцэрскую сталовую, што дазволіла ёй атрымаць доступ да агульнай ежы. Партнова атруціла ежу, прыгатаваную варожай арміі, пасля чага пацярпела больш за сто немцаў.

## АДВАЖНАЯ ПАДПОЛЬШЧЫЦА

Ленінградская піянерка Зіна Партнова пасля заканчэння сямі класаў летам 1941 года прыехала да сваёй бабулі ў вёску Шуі Шумілінскага раёна. Тут яе і застала вайна. У юным сэрцы нарадзілася пачуццё велізарнай нянавісці да ворага. Зіна Партнова ўступае ў падпольную камсамольскую арганізацыю «Юныя мсціўцы».

Па заданню арганізацыі Зіна працуе падсобнай работніцай на кухні афіцэрскай сталовай. Разам з Нінай Давыдавай ёй удалося ажыццявіць дзёрзкую дыверсію. Было знішчана больш за 100 фашыстаў. Доўгі час Зіна паспяхова выконвала цяжкія і небяспечныя заданні. Аднак фашысты высачылі яе. Зіна пайшла ў партызанскі атрад імя К. Я. Варашылава, стала разведчыцай. У партызанскім атрадзе была прынята ў камсамол.

У снежні 1943 года Зіна атрымала заданне разведаць бліжэйшыя да Обалі гарнізоны і высветліць прычыны правалу падпольнай камсамольскай арганізацыі. Заданне было выканана. Але па дарозе назад яна была схоплена гітлераўцамі. Фашысты доўга



катавалі юную партызанку. Зіна маўчала. Гітлеравец Краузе са злосцю кінуў пісталет на стол. Зазваніў тэлефон. Краузе падняў трубку, Зіна рэзкім рухам схапіла пісталет і выстраліла ў ворага. Яшчэ двух гітлераўцаў знішчыла юная патрыётка пры спробе ўцячы. Але Зіну схапілі і зноў кінулі за краты. І зноў пакуты, катаванні. Юная гераіня не сказала ні слова.

13 студзеня 1944 года пасля жорсткіх катаванняў яе пакаралі смерцю. Так абарвалася жыццё бясстрашнай падпольшчыцы-партызанкі Зіны Партновай.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з фашыстамі, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 1 ліпеня 1958 года Зінаідзе Мартынаўне Партновай прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Імя Зіны Партновай разам з імёнамі іншых загінуўшых удзельнікаў Обальскай падпольнай камсамольскай арганізацыі «Юныя мсціўцы» накрэслена на помніку-абеліску, устаноўленым ля вёскі Обаль.

Цяпер Обальская сярэдняя школа Шумілінскага раёна і вуліца ў гэтым пасёлку носяць імя Зіны Партновай.

У горадзе Ленінградзе школе № 385, дзе вучылася Зіна, а таксама аднаму з караблёў, які будуецца, прысвоена імя Зіны Партновай.

Імя гераіні занесена ў Кнігу гонару Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна.

Артыкул "Адважная падпольшчыца" у газете "Віцебскі рабочы".
23 жніўня 1975 г. (№ 167). С. 3

# Партнова Зіна

Каб адвесці ад сябе падазрэнні, Зіне прыйшлося самой паспрабаваць атручаную ежу. Дзякуючы бабулі, якая была знаёмая са сродкамі народнай медыцыны, партызанка цудам засталася жывая.

У снежні 1943 г. Зіна атрымала заданне даведацца прычыны правалу дзейнасці камсамольскага падполля "Юныя мсціўцы" і знайсці здрадніка. Заданне было выканана, аднак сама дзяўчынка была арыштаваная немцамі і адпраўлена на допыт да гестапаўскага капітана Краўзэ, які прапанаваў ёй выдаць сваіх таварышаў па падполлі. Аднак у сітуацыі, якая склалася, юная гераіня ва ўпор расстраляла свайго дазнаўца з пісталета, якой той так бестурботна пакінуў перад ёй на стале. Уцякаючы з кабінета, Зіна застрэліла яшчэ дваіх немцаў, якія кінуліся ўслед за ёй. Аднак далёка дзяўчыне сысці не ўдалося – нямецкія аўтаматчыкі прастрэлілі ёй ногі, пасля чаго здолелі затрымаць.

Зіну падвергнулі катаванням, аднак яна нічога ім не распавяла. Пасля доўгіх здзекаў садысты расстралялі адважную падпольшчыцу.

Зінаіда Партнова была пасмяротна ўдастоена звання Героя Савецкага Саюза.


Художник С.М. Бондар

# Марозава Люба

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, усе старэйшыя з сям'і Любы Марозавай сышлі на фронт, дзяўчынка ўладкавалася працаваць грузчыцай на хлебазавод, які выпякаў хлеб для акупантаў.

Нядрэнна валодаючы нямецкай мовай, люба распавядала нямецкім салдатам пра даваеннае жыццё Віцебска, пра бясплатную адукацыю, пра клопат, які праяўлялі ў краіне аб старых і дзецях, за што атрымлівала ад нямецкіх салдат пагрозы.

Пачуўшы, што ў Суражскім раёне дзейнічаюць партызаны, восенню 1941 г. Люба звязалася са сваёй настаўніцай, якая была разведчыцай Чырвонай Арміі.

У сакавіку 1942 г. на хлебзаводзе пачала працаваць падпольная група сясцёр Журынскіх, куды ўступіла і Марозава. Заданні былі самыя розныя: фіксацыя перамяшчэння варожых войск на пэўных участках чыгуначных і шашэйных дарог, распаўсюджванне сярод працоўных завода і ваеннапалоных, якія працавалі там, лістовак і зводак. Таксама Люба здабывала інфармацыю і запамінала ўмоўныя абазначэнні на машынах, якія прыбывалі на хлебзавод.

З накладных, па якіх адпускаўся хлеб, група атрымлівала і перадавала партызанам каштоўную інфармацыю аб колькасці і месцы дыслакацыі воінскіх часцей ворага, арганізоўвала дастаўку хлеба партызанам.

У верасні 1943 г., калі фронт наблізіўся да Віцебска, падпольная група Журынскіх выйшла ў партызанскую зону і была ўключана ў аператыўную групу пад кіраўніцтвам былога сакратара падпольнага гаркома партыі
У. Р. Кудзінава.

## У ФАШЫСЦКІМ ЛОГАВЕ

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны піянерцы Любе Марозавай споўнілася чатырнаццаць. Яна скончыла шэсць класаў 44-й сярэдняй школы Віцебска. Вучылася выдатна.

Калі грымнула вайна, старэйшыя з сям'і пайшлі на фронт, а Люба ўладкавалася грузчыцай на хлебазавод, які выпякаў хлеб для акупантаў. Дзяўчынка ненавідзела фашыстаў і ўсяляк старалася падкрэсліць гэта. Ведаючы нядрэнна нямецкую мову, яна ўступала ў размову з нямецкімі салдатамі і расказвала аб нашым даваенным жыцці, бясплатным навучанні, аб тых клопатах, якія праяўляліся ў нашай краіне аб дзецях. Салдаты нярэдка гаварылі ёй, што яна «чырвоная да касцей», пагражалі, што падобныя размовы могуць дрэнна скончыцца. Люба разумела і сама, што гэта не самы лепшы спосаб насаліць фашыстам, але пакуль нічога іншага не магла прыдумаць.

Пачуўшы, што ў Суражскім раёне дзейнічаюць партызаны, восенню 1941 года едзе ў Сураж да сваёй даваеннай настаўніцы М. М. Ануфрыевай. Юная патрыётка была на правільным шляху: яе настаўніца з'яўлялася разведчыцай Чырвонай Арміі.



У сакавіку 1942 года на хлебазаводзе пачала дзейнічаць падпольная група сясцёр Журынскіх. Наглядаючы за Любай, яны пераканаліся ў яе адданасці Радзіме і ўцягнулі ў падпольную работу. Даручэнні былі самыя разнастайныя: яна фіксавала перасоўванне варожых войск на пэўных участках чыгуначных і шасейных дарог, распаўсюджвала сярод рабочых завода і ваеннапалонных, якія працавалі там, лістоўкі і зводкі, падслухоўвала размовы сярод рабочых і варожых салдат, запамінала ўмоўныя абазначэнні на аўтамашынах, прыбыўшых на хлебазавод.

З накладных, па якіх адпускаўся хлеб, група атрымлівала і перадавала партызанам каштоўную інфармацыю аб колькасці і месцы дыслакацыі воінскіх часцей ворага, арганізоўвала дастаўку хлеба партызанам. У падагульняючай справаздачы падпольнага гаркома партыі гаворыцца: «Праз агентуру «Андрэя» (камуніст А. І. Бекішаў, з якім была звязана група Журынскіх. — **Аўтары**), зімой 1942—1943 гг. двойчы вывозіўся на аўтамашынах да партызан хлеб. Адзін раз было вывезена 500 кілаграмаў па падробленаму талону, другі раз — 350 кілаграмаў».

У верасні 1943 года, калі фронт наблізіўся да Віцебска, падпольная група Журынскіх выйшла ў партызанскую зону і была ўключана ў аператыўную групу пад кіраўніцтвам былога сакратара падпольнага гаркома партыі В. Р. Кудзінава.

У пасляваенныя гады яна скончыла сярэднюю школу, Мінскі юрыдычны інстытут. Цяпер Марозава (Мурашка) Любоў Васільеўна працуе ў Мінскім абкоме КПБ.

Артыкул "У фашысцкім логаве" у газете "Віцебскі рабочы". 10 верасня 1975 г. (№ 179). С. 3

# Калабанава Жэня

Нарадзілася Жэня ў Веліжы Смаленскай вобласці, дзе скончыла сямігодку. Вайну сустрэла ўжо ў Віцебску і, не ведаючы стомленасці, выконвала адказныя даручэнні камандавання партызанскай брыгады "Аляксея" і кіраўніцтва віцебскага падполля.

Дзяўчына была сувязной, разведчыцай, правадніком і ўдзельнікам баявых аперацый партызан. Акрамя гэтага Жэня вывучыла падрыўную справу і была інструктарам для падрыўных груп і ўстанавіла нумары ўсіх размешчаных у Віцебску ваенных устаноў, тым самым арганізаваўшы сувязь з дзеючымі ў горадзе групамі. Неаднаразова дастаўляла ў горад выбуховыя рэчывы і кіравала арганізацыяй выбухаў на аэрадроме. Перадавала ў падпольную групу літаратуру, лістоўкі і каштоўныя дакументы. У кастрычніку 1942 г. асабіста суправаджала у партызанскую брыгаду "Аляксея" машыну з ваеннапалоннымі, якія ўцяклі з віцебскага аэрадрома.

"Маленькая, чарнавокая дзяўчынка", як называлі яе партызаны-аляксееўцы, загінула пры разгроме варожага гарнізона ў Білева, недалёка ад Віцебска.

Калабанава Яўгенія была пасмяротна ўзнагароджана медалём "Партызану Айчыннай вайны" I ступені.



ЖЫЦЦЁ, ЯК ВОДБЛІСК МАЛАНКІ

У Жэні Калабанавай было кароткае, але яркае, як водбліск маланкі, жыццё. Нарадзілася яна ў Веліжы Смаленскай вобласці, скончыла сямігодку. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны жыла ў Віцебску. Не ведаючы стомы, выконвала адказныя даручэнні камандавання партызанскай брыгады «Аляксея» і кіраўніцтва віцебскага падполля. Жэня была сувязной, разведчыцай, праваднікам, удзельнікам баявых аперацый партызан, дастаўляла тол і міны падпольшчыкам для правядзення дыверсій, загадвала складам узрыўчаткі, выратоўвала ваеннапалонных.

У калёсах з двайным дном Жэня даставіла ў горад не адну партыю магнітных мін. Патрыёты-падпольшчыкі закладвалі іх у тэндары паравозаў, у вугаль, прыкладвалі да цыстэрнаў з гаручым. У аперацыях прымала ўдзел і сама Жэня. Апрача таго, яна дастаўляла ў падпольную групу літаратуру і лістоўкі. Суправаджала ў кастрычніку 1942 года ў партызанскую брыгаду «Аляксея» машыну з ваеннапалоннымі, якія ўцяклі з віцебскага аэрадрома.

Партызаны-аляксееўцы так пісалі пра Жэню Калабанаву ў газеце «Віцебскі рабочы» за 23 лютага 1943 года: «Гэта маленькая, чарнавокая, па знешняму выгляду самая звычайная дзяўчына рабіла вялікія справы. Аб тым, як яна прывезла на машыне з Віцебска да партызан ваеннапалонных, як даставала каштоўныя дакументы, займалася дыверсійнай работай, якія дакладныя і патрэбныя звесткі прыносіла ў атрад, як любілі яе ўсе, хто працаваў разам з ёю, — можна напісаць вялікую і цікавую кнігу. З якой любоўю і радасцю сустракалі мы Жэню, калі яна прыходзіла да нас адтуль, дзе быў вораг!

...Любоў да Радзімы, да роднай беларускай зямлі зрабіла Жэню смелай, адважнай і мужнай».

Загінула Жэня пры разгроме варожага гарнізона ў Білеве, непадалёку ад Віцебска. Яна першай увярвалася ў каравульнае памяшканне і была цяжка ранена. Калі фашысцкі афіцэр стаў дапытваць яе, яна плюнула яму ў твар. Гітлеравец выпусціў у Жэню ўсю абойму...

Пасмяротна Жэня ўзнагароджана медалем «Партызану Айчыннай вайны» I ступені.

Артыкул "Жыццё, як водбліск маланкі" у газеце "Віцебскі рабочы". 10 верасня 1975 г. (№ 179). С. 3

# Лукашонак Анісся

Перад вайной сям'я чатырнаццацігадовай Аніссі пераехала з пагранічнай вёскі Сідарэнкі ў вёску Прошкі.

З першых дзён вайны ўсе родныя дзяўчынкі сталі актыўнымі падпольшчыкамі і партызанамі. Старэйшы брат спачатку ўзначальваў знішчальны атрад, а з прыходам ворага стаў адным з кіраўнікоў баявога Прошкаўскага падполля.

Анісся шмат дапамагала народным мсціўцам, у тым ліку, выконвала ролю сувязны падполля, а таксама здабывала патрэбныя рэчы і прадукты для партызан.

Дзяўчынка валодала ўсімі сакрэтамі і таямніцамі жыцця падпольнай арганізацыі: ведала, дзе захоўваюцца савецкія кнігі, зброя, хто актыўна дапамагаў партызанам, а хто супрацоўнічаў з ворагам. Піянерка ўдзельнічала ў падрыхтоўцы і правядзенні аперацыі па ўходу падпольшчыкаў у партызанскі атрад.

Юная патрыётка зрабіла вялікі ўклад у партызанскі рух, аднак не дачакалася светлага дня Перамогі. Уся сям'я Аніссі і сама дзяўчынка трапіла ў рукі карнікаў і была па-зверску закатаваная.

На першым пасляваенным камсамольскім сходзе дзяўчынка была пасмяротна прынята ў арганізацыю разам з тымі, хто па якой-небудзь прычыне не трапіў у спісы падпольшчыкаў.

## СУВЯЗНАЯ ПАДПОЛЬНАЙ ГРУПЫ

Сваю кнігу аб Прошкаўскім падполлі «Спытайце ў бяроз...» Ул. Хазанскі пачынае з расказу пра чатырнаццацігадовую Аніську Лукашонак.

Перад вайной з пагранічнай вёскі Сідарэнкі сям'я Аніссі пераехала ў вёску Прошкі. Дзяўчынка скончыла шэсць класаў Ігналінскай школы Асвейскага раёна, была актыўнай піянеркай.

Фашысцкае нашэсце яна перажывала вельмі цяжка. Уся яе сям'я і блізкія сваякі з першых дзён акупацыі сталі актыўнымі падпольшчыкамі і партызанамі. Старэйшы брат Рыгор спачатку ўзначальваў знішчальны атрад, а з прыходам гітлераўцаў стаў адным з кіраўнікоў баявога Прошкаўскага падполля.

Дзяўчынка актыўна дапамагала падпольшчыкам, выконвала многія іх заданні, у тым ліку і ролю сувязной падполля. А колькі разоў Аніська збірала ў найбольш надзейных аднавяскоўцаў прадукты, цёплыя рэчы для партызан, а затым разам з дарослымі перапраўляла ўсё сабранае ў лес.



Аніська валодала ўсімі тайнамі падпольнай арганізацыі: ведала, дзе захоўваюцца савецкія кнігі, дзе закапана зброя, хто ў вёсцы актыўна дапамагае партызанам, а хто супрацоўнічае з ворагам. Піянерка ўдзельнічала ў падрыхтоўцы і правядзенні аперацыі па ўходу падпольшчыкаў у партызанскі атрад. Калі партызаны пад выглядам паліцэйскіх інсцэніравалі «арышт» падпольшчыкаў, Аніська стаяла пасярод вуліцы, злосна лаялася і плакала горкімі слязамі, каб умацаваць у жыхароў вёскі думку, што рабят забралі паліцэйскія.

Многа іншых, можа, не вельмі прыкметных, але крайне важных патрыятычных спраў на рахунку адважнай піянеркі.

Юная патрыётка не дачакалася светлага дня Перамогі. Калі старэйшы брат нарваўся на засаду і трапіў у рукі карнікаў, гітлераўцы арыштавалі і па-зверску замучылі ўсю сям'ю. Не пашкадавалі яны і Аніську.

У спісах падпольшчыкаў яе не аказалася, але старэйшыя таварышы ўспамінаюць дзяўчынку з асобай цеплынёй. Таму на першым пасляваенным камсамольскім сходзе падпольшчыкі, якія засталіся ў жывых, прынялі ў арганізацыю ўсіх, хто быў з імі ў адным страі, але па тых або іншых прычынах афіцыйна не быў залічан у арганізацыю. Сярод іх была і Анісся Сяргееўна Лукашонак.

Артыкул "Сувязная падпольнай групы" у газете "Віцебскі рабочы" 17 верасня 1975 г. (№ 184). С. 3

# Спірыдонава Галя

Вайна заспела Галю ў Гарадку, куды яна прыехала з Ленінграда пагасціць да сваякоў на летнія канікулы. Гора, слёзы і перажытыя пакуты мірнага насельніцтва падштурхнулі яе далучыцца да групы такіх жа хлопцаў і дзяўчат, якія хацелі адолець ворага. Адважныя піянеры збіралі савецкія лістоўкі і падкідвалі іх у нямецкія ўстановы, а кінутыя зброю і патроны хавалі ў агародзе ля дома Галі.

Улетку 1942 г. Галя стала партызанкай. Яе паролем быў чырвоны піянерскі гальштук. Сваё баявое хрышчэнне яна атрымала ў баі пад Гарадком, ратуючы жыццё параненаму байцу, за што атрымала першую падзяку ад штаба брыгады.

З 15 верасня 1942 г. па ліпень 1944 г. дзяўчына лічылася ў партызанскім атрадзе «Сталінец» брыгады ім. С.М. Кароткіна на пасадзе медыцынская сястры, затым яе перавялі ў атрад ім. І. В. Сталіна брыгады ім. У. І. Леніна Віцебскай вобласці.

За два гады суровага партызанскага жыцця Галя прыняла ўдзел у баях супраць карных экспедыцый фашыстаў, была ўдзельніцай рэйкавай вайны, хадзіла ў разведку. Пасля выратавання жыцця цяжка раненага ў баі камандзіра юную камсамолку прызначылі палітруком ўзвода. Гэты абавязак Галя выконвала да злучэння партызан з часцямі Чырвонай Арміі.

24 верасня 1972 г. Галіна Спірыдонава была залічана ў батальён беларускіх арлянят. За баявыя заслугі прадстаўлена да ўрадавай узнагароды – медалём "Партызана Айчыннай вайны" І ступені.



## ПАРОЛЬ—ПІЯНЕРСКІ ГАЛЬШТУК

Галю Спірыдонаву вайна заспела ў Гарадку, куды яна прыехала з Ленінграда на школьныя канікулы. Гора і слёзы, здзекі фашыстаў з мірнага насельніцтва і смерць убачыла Галя. Яна, як і ўсе піянеры, марыла аб барацьбе з ворагам. У горадзе стварылася група рабят, куды ўвайшла і Галя. Яны збіралі савецкія лістоўкі і расклейвалі іх у горадзе, падкідвалі ў нямецкія ўстановы. Збіралі кінутыя вінтоўкі, патроны, а аднойчы знайшлі нават кулямёт. Усё гэта рабяты закопвалі ў агародзе, ля дома, дзе жыла Галя.

Улетку 1942 года, нікому не сказаўшы ні слова, Галя пайшла ў партызанскі атрад. Паролем ёй паслужыў піянерскі гальштук, які яна прынесла з сабой. Спачатку яе пакінулі пры штабе, потым па яе просьбе перавялі ва ўзвод медыцынскай сястрой. Так Галя Спірыдонава стала партызанкай брыгады імя Леніна. Першае сваё баявое хрышчэнне яна атрымала ў баі пад Гарадком, дзе выратавала жыццё раненаму байцу і атрымала першую падзяку ад штаба брыгады.

За два гады суровага партызанскага жыцця Галі давялося прымаць удзел у баях супраць карных экспедыцый фашыстаў, быць удзельніцай рэйкавай вайны, хадзіць у разведку, выратоўваць жыццё раненым.

Неўзабаве Галю Спірыдонаву прынялі ў камсамол.

Аднойчы, выратоўваючы ў баі цяжка раненага камандзіра, Галя пачула нямецкія галасы. Фашысты прапаноўвалі ёй здацца. Адстрэльваючыся з аўтамата, яна паўзла да лесу. Акупанты працягвалі яе праследаваць. Калі скончыліся патроны, Галя дастала з кішэні «малютку» і кінула яе ўбок чужынцаў. Яны гэтага не чакалі. Выкарыстаўшы іх замяшанне, Галя скрылася ў лесе.

Пасля гэтага бою юная камсамолка была назначана палітруком узвода, а затым — палітруком узвода разведкі. Гэты абавязак Галя Спірыдонава выконвала да злучэння партызан з часцямі Чырвонай Арміі.

Цяпер Галіна Мікалаеўна Спірыдонава жыве ў Ленінградзе, працуе ўрачом-стаматолагам у адной з паліклінік горада-героя. Яна залічана ў батальён беларускіх арлянят.

Артыкул "Пароль - піянерскі гальштук" у газеце "Віцебскі рабочы". 24 верасня 1975 г. (№ 189). С. 3

# Коля, Дзіна і Эма Лынчанкі

Павел Лынчанка пайшоў на фронт у першыя дні вайны і загінуў пад Смаленскам. На руках у яго жонкі Наталлі засталося трое малалетніх дзяцей – Коля, Дзіна і Эма. Усе трое вучыліся ў школе № 18 г. Віцебска.

Кватэра Наталлі выкарыстоўвалася падпольнай групай Т. А. Марудава, а таксама была явачнай армейскай разведгрупы Юрыя Рудакова. Коля, Дзіна і Эма самаахвярна змагаліся ў Віцебскім падполлі, выконваючы ролю сувязных: хлопчык падтрымліваў рэгулярную сувязь з падпольшчыкам Андрэем Скуманам з вёскі Загор'е, а сёстры былі сувязнымі ў горадзе.

Акрамя гэтага дом Лынчанкі з'яўляўся зручным назіральным пунктам, бо знаходзіўся недалёка ад чыгункі, якая вяла на Смаленск, а вуліца акадэміка Паўлава, на якой размяшчаўся будынак, звязвала цэнтр горада з усім раёнам Маркаўшчыны. Пастаяннае назіранне за бесперапынным патокам варожых машын і тэхнікі было даверана весці дзецям, якія былі ў курсе ўсіх спраў падпольнай групы.

У лютым 1943 г. у ходзе правалу задання аднаго з піянераў, які з'яўляўся сувязным, гітлераўцамі былі арыштаваныя і падвергнуты на вачах у дзяцей самым жорсткім катаванням іх маці і некалькі падпольшчыкаў. Не выдалі пад здзекамі сваіх таварышаў і дзеці.

Маці Колі, Дзіны і Эмы расстралялі, а саміх дзяцей пакінулі ў доме, разлічваючы, што хтосьці з падпольшчыкаў прыйдзе на яўку, аднак юныя героі змаглі папярэдзіць асаблівым знакам сувязную Спірыдонаву аб небяспецы. Больш ніхто не пацярпеў.

Доўга блукалі сіроты ў пошуках прытулку, перамагаючы голад, холад і страх, але на шчасце адважныя патрыёты змаглі дачакацца светлага дня Перамогі.

За мужнасць і стойкасць у барацьбе з ворагам Мікалай Лынчанка ўзнагароджаны медалём "За адвагу", а Дзіна і Эма – медалём "За баявыя заслугі". Іх маці, Наталля Лынчанка, узнагароджана пасмяротна.

## СЯМ'Я ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ

У даваеннай работніцы фабрыкі «КІМ» Наталлі Лынчанка было трое дзяцей. Калі пачалася вайна, старэйшаму Мікалаю ішоў дванаццаты, а яго сястрычкам Дзіне і Эме адпаведна было дзевяць і сем год. Вучыліся яны ў 18-й сярэдняй школе г. Віцебска. Бацька іх, Павел Лынчанка, пайшоў на фронт у першыя дні вайны і загінуў пад Смаленскам.

Кватэра Н. Ф. Лынчанка па вуліцы акадэміка Паўлава, 5 выкарыстоўвалася падпольнай групай Т. А. Марудава, а затым армейскай разведгрупай Юрыя Рудакова як явачная. Сюды збіралася пошта ад групы Марудава, паступалі шыфроўкі, бланкі розных дакументаў, узоры пячатак і штампаў ад падпольшчыкаў Старога Сяла і Лётцаў. Сама Наталля Фёдараўна і ўсе яе дзеці самаададдана змагаліся ў віцебскім падполлі, выконваючы ролю сувязных. Коля падтрымліваў рэгулярную сувязь з падпольшчыкам Андрэем Скуманам з вёскі Загор'е, Дзіна і Эма былі сувязнымі па гораду. Дзеці вельмі добра і аператыўна выконвалі ўсе заданні.

Апрача таго, дом Лынчанкі быў цудоўным назіральным пунктам. Ён стаяў непадалёку ад чыгуначнай веткі на Смаленск, а вуліца акадэміка Паўлава звязвала цэнтр горада з усім раёнам Маркаўшчыны. І па ёй бесперапынным патокам рухаліся варожыя машыны, ваенная тэхніка і г. д. Пастаянны нагляд за гэтымі дзвюма транспартнымі магістралямі было даручана весці дзецям. Коля, Дзіна і Эма фактычна былі ў курсе ўсіх спраў падпольнай групы: яны ведалі кіраўніка групы, многіх сувязных і падпольшчыкаў, месца, дзе захоўваліся шрыфты і іншая падпольная пошта, характар заданняў, якія выконвала група.

У лютым 1943 года ў выніку правалу сувязнога — піянера Паўліка Сакалоўскага былі арыштаваны Н. Ф. Лынчанка і выратаваны ёю з лагера ваеннапалонны камуніст-падпольшчык Г. Н. Озераў. На вачах у дзяцей гітлераўцы збівалі маці, Озерава і Паўліка, стралялі над іх галовамі, патрабавалі назваць іншых удзельнікаў групы.

Дарослыя цярпелі пакуты і маўчалі, тым самым даючы зразумець дзецям, што трэба маўчаць і ім. Потым фашысты сталі здзекавацца над старэйшымі дзецьмі—Колем і Дзінай, крычалі на іх і патрабавалі назваць усіх, хто прыходзіў да іх у дом. Дзеці ўпорна маўчалі. Тады фашысты рашылі падкупіць маленькую Эму, прапануючы ёй шакаладку. Але і яна нічога не сказала катам.

Калі ў кватэры ішоў вобыск і гітлераўцы заняліся разглядам знойдзеных фатаграфій, Дзіна непрыкметна дастала з-пад дошкі стала шыфроўкі і схавала пад сукенку. А калі карнікі пайшлі, спаліла іх.

Маці, Озерава і Паўліка фашысты расстралялі, а дзяцей пакінулі, разлічваючы, што нехта прыйдзе на яўку.

У слязах і трывозе дачакаліся яны раніцы і, нягледзячы на тое, што за домам сачылі, змаглі знакам папярэдзіць аб небяспецы сувязную Е. С. Спірыдонаву, паведамілі аб здарыўшымся кіраўніку групы і ў Загор'і. Ніхто з групы больш не пацярпеў.

Лёгка можна ўявіць, колькі гора і пакут вынеслі юныя патрыёты, застаўшыся адны. Яны блукалі па розных месцах, гублялі адзін аднаго і знаходзілі зноў, пазналі голад, холад і страх. На шчасце, усе яны засталіся жывыя, дачакаліся светлага дня вызвалення.

Жывуць і працуюць Лынчанкі ў Маскве. За мужнасць і стойкасць у барацьбе з ворагам Мікалай Лынчанка ўзнагароджан медалем «За адвагу», а Дзіна і Эма — медалем «За баявыя заслугі». Пасмяротна ўзнагароджана і іх маці — Н. Ф. Лынчанка.







**На здымку:** Мікалай, Дзіна і Эма Лынчанкі.

Артыкул "Сям'я падпольшчыкаў". 27 верасня I975 г. (№ I92). С. 3

# Давыдаў Віця

Вайна застала Віцю Давыдава ў вёсцы Шалашнікі Расонскага раёна, дзе ён гасцяваў у сваёй бабулі. Даведаўшыся, што яго дзядзькі Пётр і Мікалай Гігелевы уступілі у партызанскі атрад, хлопчык стаў прасіцца з імі. Нічым нельга было пераканаць адважнага піянера.

Так, з красавіка 1942 г. Віця стаў мсціўцам партызанскага атрада ім. Шчорса, якім у той час камандаваў П.М. Машэраў. Дзякуючы смеласці і рашучасці юнага патрыёта, партызаны не раз бралі хлопчыка з сабой у засады супраць фашыстаў.

14 мая 1942 г. на шашэ Полацк – Себеж, партызаны зладзілі засаду нямецкім войскам. Як толькі абоз наблізіўся, па варожых войскам быў адкрыты агонь. Аднак колькасная перавага апынулася на баку акупантаў. У завязаўшымся баі Віця поводзіў сябе мужна: пад агнём праціўніка, перабягаючы ад аднаго партызана да іншага, падносіў ім боепрыпасы, а таксама забіраў у забітых немцаў зброю. Аднак у адну з такіх вылазак адбылося трагічнае – доўгая чарга, выпушчаная ворагам, абарвала жыццё адважнага героя.

Смерць Віктара Давыдава была адпомшчана партызанамі Расоншчыны.

## БОЙ НА ШАСЭ

Трынаццацігадовы піянер Віця Давыдаў вучыўся ў адной з ленінградскіх школ на Васільеўскім востраве. З дзяцінства ён штогод прыязджаў на лета ў вёску да сваёй бабулі. Віця добра ведаў і любіў гэтыя мясціны. Тут, у вёсцы Шалашнікі Расонскага раёна, яго і застала Вялікая Айчынная вайна. А праз некаторы час сюды ўварваліся гітлераўскія захопнікі. Кемлівы і цікаўны Віця неўзабаве даведаўся, што яго дзядзькі Пётр і Мікалай Гігелевы маюць намер уступіць у адкрытую барацьбу з акупантамі і з гэтай мэтай хочуць пайсці ў партызанскі атрад.

Пераканаўшыся, што гэта так, Віця пачаў прасіцца, каб яны ўзялі з сабой і яго. Дзядзькі адмаўлялі, але Віця настаяў на сваім. Так з красавіка 1942 года ён стаў юным мсціўцам партызанскага атрада імя Шчорса, якім у той час камандаваў П. М. Машэраў. Ведаючы смеласць і рашучасць Віці, партызаны часта бралі яго з сабой у засады супраць фашысцкіх разбойнікаў. Так было і на гэты раз.



14 мая 1942 года на шасэ Полацк—Себеж, па якому пастаянна рухаліся фашысцкія войскі, партызанамі была арганізавана засада. Як толькі абоз з гітлераўцамі наблізіўся, яны адкрылі агонь па акупантах. Але, як гэта нярэдка бывала, сілы аказаліся няроўнымі: фашыстаў было значна больш, чым народных мсціўцаў. Ды і ўзброены яны былі намнога лепш за партызан.

У завязаўшымся баі Віця паводзіў сябе мужна. Ён, перабягаючы пад агнём праціўніка ад аднаго партызана да другога, увесь час падносіў ім боепрыпасы. А калі запас патронаў у партызан падыходзіў да канца, Віця праявіў храбрасць і знаходлівасць. Ён паўзком падбіраўся да забітых гітлераўцаў, забіраў у іх зброю і прыносіў яе партызанам. Але ў нейкую долю секунды адбылося трагічнае: доўгая чарга, выпушчаная недабітым фашыстам з аўтамата, скасіла Віцю. Так заўчасна абарвалася жыццё юнага смельчака.

— Адпомсцім ворагу за смерць адважнага піянера, — пакляліся партызаны над свежай магілай Віці. І клятву сваю яны стрымалі: нямала фашысцкіх захопнікаў знайшлі сабе магілу ад рук гераічных партызан Расоншчыны.

Пахаваны Віця на могілках у вёсцы Клясціцы. На яго магіле ўстаноўлен абеліск.

Артыкул "Бой на шасэ" у газеце "Віцебскі рабочы". 12 снежня 1975 г. (№ 244). С. 3

# Дземеш Вольга

Вясной 1941 г. Оля скончыла сёмы клас, як вайна прыйшла ў яе родны горад. На свае вочы дзяўчынка бачыла масавыя расстрэлы мірнага насельніцтва і здзекі над савецкімі патрыётамі. Оля разумела, што ў свае чатырнаццаць гадоў будзе непроста супрацьстаяць узброеным да зубоў ворагам. Дзякуючы сваёй настойлівасці адважная патрыётка стала ў 1942 г. партызанкай. Разам з малодшай 12-гадовай сястрой Лідай яны падрывалі варожыя эшалоны, забівалі ворагаў і падкладалі пад цягнікі міны. Акрамя гэтага Оля выконвала ўсе абавязкі партызан па выведцы і дыверсіям у г. Оршы супраць нямецкіх захопнікаў.

Малодшую сястрычку Ліду і маці адважнай народнай мсціўцы расстралялі, а саму партызанку вельмі актыўна пачалі шукаць. Немцы распаўсюджвалі лістоўкі, у якіх абяцалі хворую суму таму, хто выдасць Олю. Але дзяўчынка не пераставала змагацца.

7 чэрвеня 1942 г. Оля трапіла ў брыгаду "Чэкіст" партызанскага атрада
ім. Шамарына, дзе служыла на карысць Радзімы. Падчас знаходжання сярод партызан, дзяўчына паказала сябе бясстрашнай разведчыцай: спусціла пад адхон 7 варожых эшалонаў з жывой сілай, тэхнікай і харчаваннем, удзельнічала ў разгроме некалькіх нямецка-паліцэйскі гарнізонаў.

За актыўны ўклад у барацьбу з нямецка-фашысцкімі акупантамі Вольга Дземеш ўзнагароджана ордэнам Славы III ступені і медалём "Партызану Айчыннай вайны" I ступені.



ГЕРАІЧНАЕ ЮНАЦТВА

У чэрвені 1941 года Оля Дземеш скончыла 7 класаў аршанскай сярэдняй школы № 10 (былой № 80). А праз месяц у яе родны горад уварваліся гітлераўскія захопнікі. З першых жа дзён фашысты паказалі, што яны прынеслі савецкаму народу. Оля сваімі вачыма ўбачыла і масавыя расстрэлы мірнага насельніцтва, і здзекі гітлераўцаў над савецкімі патрыётамі. Ужо тады ў сэрцы юнай піянеркі зарадзілася імкненне да актыўнай барацьбы з акупантамі. Разам з тым яна добра разумела, што ў свае чатырнаццаць год не так проста змагацца з узброенымі да зубоў карнікамі. І вось у чэрвені 1942 года Вольга Дземеш, дзякуючы сваёй настойлівасці, становіцца партызанкай.

Аднойчы Вольгу выклікаў да сябе камандзір і сказаў:

— Оля, трэба паставіць міну пад цыстэрну з бензінам на станцыі Орша. Помні: толькі пад цыстэрну з бензінам!

Але як сярод мноства скапіўшыхся на станцыі жоўтых і чорных цыстэрн знайсці іменна тую, што трэба? І Оля рашыла ўзяць сабе на дапамогу дванаццацігадовую сястрычку піянерку Ліду.

— Шукаць патрэбную цыстэрну давялося вельмі доўга, — успамінае В. В. Дземеш.— Мы кідалі каменьчыкамі па цыстэрнах і па гуку вызначалі, якая з іх напоўнена. Затым мы ляжалі пад эшалонамі, прынюхваліся, падстаўлялі далоні і па капяжу вызначалі, дзе бензін...

Пасля доўгіх пошукаў на станцыі Орша-Цэнтральная Вольга і Ліда прымацавалі магнітную міну там, дзе трэба было. Узарвалася яна ў дакладна разлічаны час. Пажарам, які ўзнік у выніку выбуху міны, было знішчана многа варожай ваеннай тэхнікі.

Гэта толькі адзін эпізод з баявой біяграфіі Вольгі, а іх на яе рахунку было нямала. Былы камандзір 8-й партызанскай брыгады Герой Савецкага Саюза С. Г. Жунін, у саставе якой з красавіка 1943 года змагалася Вольга Дземеш, у сваёй кнізе «Ад Дняпра да Буга» ўказвае, што акупанты актыўна шукалі юную партызанку. Яны распаўсюдзілі спецыяльную лістоўку, у якой абяцалі вялікую суму грошай таму, хто выдасць Вольгу Дземеш. Юная партызанка была нязлоўнай. У адказ на гэту фашысцкую акцыю яна яшчэ больш мужна працягвала змагацца з ненавісным ворагам. Аб гэтым і сведчаць баявыя характарыстыкі на яе, якія захаваліся ў архівах: «...прымала актыўны ўдзел у барацьбе з нямецкімі захопнікамі з 7 чэрвеня 1942 г. па 10 красавіка 1943 г. у саставе партызанскага атрада № 15 брыгады «Чэкіст»... У час знаходжання ў партызанах, будучы малалетняй, паказала сябе бясстрашнай разведчыцай. Спусціла пад адхон сем варожых эшалонаў з жывой сілай, тэхнікай і харчаваннем, удзельнічала ў разгроме некалькіх нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў, на сваім рахунку мае 20 знішчаных варожых салдат. Удзельніца рэйкавай вайны». За актыўны ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі ўзнагароджана ордэнам Славы III ступені і медалем «Партызану Айчыннай вайны» І ступені.

Маці Вольгі — Ефрасінню Георгіеўну і сястрычку Ліду фашысцкія вылюдкі расстралялі. А Вольга Уладзіміраўна Дземеш (Вагіна) цяпер жыве ў Цюмені. На прыкладах свайго гераічнага юнацтва, якое прайшло скрозь вогненныя гады вайны, яна праводзіць вялікую грамадскую работу па патрыятычнаму выхаванню моладзі.

Артыкул "Гераічнае юнацтва" у газеце "Віцебскі рабочы". 23 снежня 1975 г. (№ 251). С. 3

# Дзенісенка Валодзя

Валодзя Дзенісенка жыў у вёсцы Сілкі Гарадоцкага раёна. Мястэчка было акружана лесам, таму захопнікі там доўга не затрымліваліся. Прыходзілі толькі, каб забраць апошняе ў мірнага насельніцтва, а потым – у Гарадок, там знаходзіўся іх гарнізон.

Многія аднавяскоўцы Валодзі, у тым ліку і яго бацька, сталі народнымі мсціўцамі і далучыліся да партызанаў, якія заўсёды былі жаданымі гасцямі ў вёсцы. У той жа час клопат пра сям'ю легла на плечы хлопчыка, які навучыўся кіраваць гаспадаркай і дапамагаць маці ў хатніх справах.

У студзені 1943 г. Сілкі акружылі, а большую частку насельніцтва і жывёлу сагналі. Валодзю ўдалося ўцячы ў лес, дзе ён сустрэў партызан. Ужо з сакавіка 1943 г. адважны хлопчык уступіў у шэрагі атрада "Сібірак".

За два цяжкія гады хлапчук моцна ўзмужнеў, многае перажыў і убачыў, нямала прайшоў па партызанскіх сцежках. Будучы байцом камендацкага ўзвода і сувязным штаба брыгады ўдзельнічаў у аперацыі "Прарыў" на Ушацка-Лепельскай партызанскай зоне вясной 1944 г. Валодзю разам з радысткай было неабходна вырвацца з акружэння праціўніка і любой цаной вынесці акумулятары для рацыі. Акрамя гэтага, ва ўмовах сачэння і шквалу куль праціўніка, трэба было несці цяжкую сумку, вінтоўку і рэчмяшок. Нягледзячы на складанасці і небяспеку, заданне было выканана паспяхова.

За ўдзел у баявых аперацыях атрада, гераізм і мужнасць ва ўмовах прарыву Уладзімір Дзенісенка быў узнагароджаны медалямі "Партызану Айчыннай вайны" II ступені і "За перамогу над Германіяй".



НА ПРАРЫЎ

Мірнае і бесклапотнае жыццё для піянера 6-га класа Аляксандраўскай сярэдняй школы Гарадоцкага раёна Валодзі Дзенісенкі скончылася ў трынаццаць гадоў. Пачалася вайна.

Яго родная вёска Сілкі была акружана лесам, таму фашысты ў ёй доўга не затрымліваліся: прыедуць, аграбяць мірнае насельніцтва — і хутчэй у Гарадок, у гарнізон.

Жаданымі і частымі гасцямі тут былі партызаны. Многія аднавяскоўцы сталі народнымі мсціўцамі. У жніўні 1942 года пайшоў у партызаны і старшыня мясцовага калгаса — бацька Валодзі.

З гэтага часу ўсе мужчынскія клопаты ў сям'і ляглі на плечы Валодзі. Ён навучыўся араць, малаціць, дапамагаў маці і малодшым сёстрам па гаспадарцы. І ўсёй вёскай разам дапамагалі партызанам.

У студзені 1943 года вёску Сілкі акружылі карнікі. Забралі амаль усё насельніцтва, жывёлу. Валодзю ўдалося ўцячы ў лес і прабрацца да партызан. З сакавіка 1943 года ён стаў радавым атрада «Сібірак».

За два гады барацьбы хлапчук многае перажыў і ўбачыў, прайшоў партызанскімі сцежкамі многія кіламетры, вырас і ўзмужнеў. Удзельнічаў у вядомай аперацыі «Прарыў» ва Ушацка-Лепельскай партызанскай зоне вясной 1944 года. У гэты час Валодзя быў байцом камендацкага ўзвода і сувязным штаба брыгады. На гэты ўзвод ускладалася задача аховы штаба брыгады.

Адступаючы, гітлераўцы імкнуліся абясшкодзіць свае тылы, знішчыць партызанскія раёны. З гэтай мэтай у красавіку 1944 года яны кінулі супраць партызан Ушацка-Лепельскай зоны буйныя сілы карнікаў з артылерыяй, авіяцыяй, танкамі. Калі кальцо блакады стала сціскацца, партызаны пайшлі на прарыў. Валодзя атрымаў заданне выбрацца з акружэння разам з радысткай і любой цаной вынесці акумулятары да рацыі.

Даручэнне не з лёгкіх, калі ўлічыць узрост партызана і складаную абстаноўку. Пад ураганным артылерыйска-мінамётным агнём праціўніка трэба было несці цяжкую сумку вагой каля васьмі кілаграмаў, вінтоўку і рэчавы мяшок з патронамі і сухарамі.

Удача спадарожнічала юнаму байцу. Ён захаваў каштоўную ношу, уцалела і радыстка. Сувязь была забяспечана.

За ўдзел у баявых аперацыях атрада, гераічныя паводзіны ў цяжкіх умовах прарыву Валодзя быў узнагароджан медалямі «Партызану Айчыннай вайны II ступені», «За перамогу над Германіяй».

У партызанскім атрадзе Валодзя стаў камсамольцам.

Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ён працаваў трактарыстам, брыгадзірам трактарнай брыгады, аднаўляў разбураную вайной гаспадарку.

У 1950 годзе быў прызваны ў Савецкую Армію, дзе праслужыў 26 год, большую частку з іх — у ракетных войсках. У верасні 1976 года ў званні падпалкоўніка звольнен у запас.

Цяпер камуніст У. С. Дзенісенка — начальнік штаба грамадзянскай абароны Віцебскага ветінстытута, праводзіць вялікую ваенна-патрыятычную работу. Ён часты госць школьнікаў і студэнтаў.

Артыкул "На прарыў" у газете "Віцебскі рабочы".
I8 лістапада I977 г. (№ 226). С. 4

# Клімовіч Федзя

Трынаццацігадовы хлопец з вёскі Курына Віцебскага раёна Федзя Клімовіч трапіў у партызанскі атрад у пачатку 1942 г. Смелы, добрасумленны і знаходлівы, ён застаўся ў роднай вёсцы партызанскім разведчыкам.

На заданні Федзя выязджаў на кані, якога далі яму партызаны. Быццам невідзімка, бясстрашны герой пранікаў туды, дзе размяшчаліся гітлераўцы, і здабываў каштоўныя звесткі.

У ноч з 27 на 28 сакавіка 1942 г. адна з такіх вылазак прынесла народным мсціўцам важныя весткі: з Віцебска выехаў батальён карнікаў у колькасці пяцісот чалавек па кірунку да вёскі Курына. Няпрошаных гасцей вырашылі сустрэць на дарозе аўтаматнай чаргой і кулямётным агнём, а Федзю адправілі ў суседнюю вёску, каб ён папярэдзіў жыхароў аб небяспецы. З'яўленне варожай калоны чакалі ў засадзе каля вёскі Платы. Партызаны адкрылі агонь з кулямёта, калі вораг падышоў да іх метраў за пяцьдзесят. З такой блізкай адлегласці кулі касілі захопнікаў напавал. Бой працягваўся тры гадзіны.

Па ўспамінах Д.Ф. Райцава, у гэтым баі Федзя змагаўся нароўні з дарослымі і паказаў сябе храбрацом. Пасля бою хлопчык быў залічаны ў партызанскі атрад, а за мужнасць, праяўленую баі, удастоены медаля "За адвагу".

Па заданні партызанскага камандавання Федзя распаўсюджваў савецкія лістоўкі ў пустых бутэльках, якія пускаў па цячэнню Дзвіны. Такім чынам, людзі заўсёды былі ў курсе навін з франтоў.

Чарговая карная экспедыцыя супраць партызан пачалася вясной 1943 г. Федзя зноў пайшоў у разведку ў родную вёску. Гэта заданне стала апошнім для адважнага юнака: яго растралялі, а затым спалілі разам з мірнымі жыхарамі.

Сёння матэрыялы пра гераічнае жыццё Фёдара Клімовіча захоўваюцца ў школьным музеі вёскі Курына.



ЧУЖЫНЦАЎ СУСТРЭЛІ АГНЁМ

Трынаццацігадовы хлапчук з вёскі Курына Віцебскага раёна Федзя Клімовіч упершыню трапіў у партызанскі атрад у пачатку 1942 года. Яго, смелага і настойлівага, пакінулі ў Курыне як партызанскага разведчыка. Любое заданне камандавання ён заўсёды выконваў добрасумленна, дзейнічаў смела і знаходліва.

Юнаму разведчыку партызаны далі каня, на якім Федзя вечарам выязджаў на адказныя заданні. Быццам невідзімка, пранікаў ён туды, дзе размяшчаліся гітлераўцы, атрымліваў каштоўныя звесткі і перадаваў іх народным мсціўцам.

Так, у ноч з 27 на 28 сакавіка 1942 года Федзя прыйшоў да партызан і расказаў камандзіру Д. Ф. Райцаву, што з Віцебска выехаў батальён карнікаў (каля пяцісот чалавек) і што рухаюцца яны ў напрамку вёскі Курына.

Камандаванне атрада хутка прадумала план разгрому варожай калоны. Нязваных гасцей рашылі сустрэць па дарозе аўтаматным і кулямётным агнём, а Федзю ў гэты час паслалі ў суседнюю вёску, каб ён папярэдзіў савецкіх людзей аб небяспецы.

Гітлераўскія захопнікі, нічога не падазраючы аб задуме партызан, спыніліся ў вёсцы Лушчыха, каб як след падсілкавацца.

Партызаны ж у гэты час знаходзіліся ў поўнай баявой гатоўнасці ў засадзе ля вёскі Платы і чакалі наяўлення варожай калоны. На даху першай ля дарогі хаты размясціўся адважны партызанскі кулямётчык Міхаіл Сільніцкі з напарнікам Лапікавым. Яны адкрылі агонь з кулямёта толькі тады, калі калона гітлераўцаў падышла да іх метраў на пяцьдзесят. З такой блізкай адлегласці іх кулі касілі захопнікаў напавал.

Тры гадзіны працягваўся бой, у якім Міхаіл Сільніцкі загінуў. Яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

— У гэтым баі, — успамінае Д. Ф. Райцаў, — Федзя змагаўся разам з дарослымі і паказаў сябе храбрым хлопцам. Пасля бою мы залічылі яго ў партызанскі атрад. За мужнасць, праяўленую ў баі, Федзя ўзнагароджан медалем «За адвагу».

Па заданню партызанскага камандавання Федзя ўдзельнічаў у аперацыі па распаўсюджанню савецкіх лістовак. Рабілі народныя мсціўцы гэта так: збіралі парожнія бутэлькі, закладвалі ў іх лістоўкі, затыкалі іх і пускалі па цячэнню Дзвіны. Нашы людзі вылаўлівалі бутэлькі, даставалі з іх лістоўкі і, такім чынам, даведваліся аб падзеях на франтах Вялікай Айчыннай вайны, аб хлусні гебельсаўскай прапаганды.

У сакавіку 1943 года фашысцкія карнікі пачалі чарговую экспедыцыю супраць партызан. І Федзя зноў пайшоў у разведку ў вёску Курына. Аднак гэта заданне было для юнага байца апошнім. Фашысцкія разбойнікі схапілі Федзю разам з мірнымі жыхарамі, якія знаходзіліся ў гэты час у вёсцы, расстралялі іх, а затым спалілі.

Храбры піянер загінуў як герой. Памяць аб ім не памрэ.

Цяперашнія Федзевы равеснікі з Курынскай школы свята ўшаноўваюць памяць аб сваім адважным земляку. У школьным музеі сабраны і беражліва захоўваюцца матэрыялы аб кароткім гераічным жыцці Федзі Клімовіча. Ён, як жывы, будзе вечна ў страі юных ленінцаў.

Артыкул "Чужынцаў сустрэлі агнём" у газеце "Віцебскі рабочы". 18 лістапада 1977 г. (№ 226). С. 4

# Багданаў Валодзя

Пра тое, што яго маці з'яўляецца партызанскай сувязной, юны Валодзя ведаў і не раз дапамагаў ёй у гэтай нялёгкай і небяспечнай справе.

Так, дзякуючы своечасоваму данясенню адважнага хлопчыка камандзіру партызанскага атрада А.М. Цімохіну аб тым, што на суседнюю вёску Юравічы рыхтуецца карная аперацыя, удалося адвесці ад яе жыхарароў навіслую небяспеку. У кароткім, але гарачым баі захопнікі былі разгромлены, а савецкія людзі выратаваны ад немінучай гібелі.

Валодзя неаднаразова выконваў небяспечныя баявыя заданні партызанскіх камандзіраў. Інфармацыю аб выніках задання ён перадаваў, выкарыстоўваючы тайнік, які знаходзіўся пад каранямі вывернутага бурай дуба.

Хлопчык і яго мама ўжо былі абвінавачаныя ворагамі ў сувязі з народнымі мсціўцамі, таму партызанскім камандаваннем было вырашана пераправіць сям'ю на Вялікую зямлю, за лінію фронту. Але Валодзя наадрэз адмовіўся з'язджаць і працягнуў дапамагаць партызанам выконваў складаныя заданні, расклейваць лістоўкі з заклікамі да савецкіх людзей узмацніць барацьбу супраць акупантаў.

Карнікі актыўна шукалі юнага патрыёта. І аднойчы Валодзя быў схоплены ў роднай вёсцы Захарнічы, а пры вобыску бацькоўскай хаты хлопчыка акупанты знайшлі агітацыйныя лістоўкі.

Нягледзячы на катаванне, юнак трымаўся устойліва і адважна. Збітага партызана-героя спачатку кінулі ў засценак, а пазней расстралялі.

Уладзімір Багданаў пахаваны на месцы сваёй трагічнай смерці на паўстанку Пазнякова.

## І сёння з намі

Ва ўрачыстыя дні юныя ленінцы Захарніцкай школы на Полаччыне па традыцыі збіраюцца на піянерскую лінейку. Праводзяцца такія лінейкі на школьным двары. Справа ад уваходу ў школу стаіць на невысокім пастаменце скромны абеліск. На ім надпіс: «Валодзю Багданаву. 1928—1942 гг. Ён і сёння стаіць з намі побач, правафлангові ў нашых радах».



Хто ж такі Валодзя Багданаў, які навечна застаўся ў страі юных піянераў школы ў Захарнічах?

Маці Валодзі Багданава Пелагея Варфаламееўна была партызанскай сувязной. Аб сувязі з народнымі мсціўцамі ведаў яе малодшы сын Валодзя, які не раз дапамагаў маці ў нялёгкай і небяспечнай рабоце.

Аднойчы Валодзя падслухаў вельмі важную размову гітлераўцаў з адным з мясцовых здраднікаў. Гаворка ішла аб расправе над савецкімі патрыётамі з суседняй вёскі Юравічы. Не марудзячы, Валодзя пабег да камандзіра партызанскага атрада А. М. Цімоніна і паведаміў яму аб небяспецы, якая навісла над жанчынамі, старымі і дзецьмі вёскі Юравічы.

Даведаўшыся ад Валодзі, што карны атрад гітлераўцаў мае намер напасці на Юравічы, партызаны ў назначаны дзень і час наладзілі засаду. У кароткім, але гарачым баі захопнікі былі разгромлены, а савецкія людзі выратаваны ад немінучай гібелі.

Валодзю неаднаразова даводзілася выконваць многія баявыя заданні партызанскіх камандзіраў. Аб выніках выкавання заданняў ён інфармаваў партызан, карыстаючыся для гэтага тайнікам, абсталяваным пад карэннямі вывернутага дуба.

Аднойчы ля тайніка Валодзю затрымаў паліцай. Але хлапчук не разгубіўся і так схапіў нямецкага прыслужніка зубамі за руку, што той, узвыўшы воўкам, выпусціў падлетка. Валодзя ў адно імгненне схаваўся ў хмызняку.

Партызанскае камандаванне, прымаючы пад увагу, што Валодзя і яго маці ўжо заўважаны ў сувязях з народнымі мсціўцамі, рашыла пераправіць іх на Вялікую зямлю, за лінію фронту. Аднак Валодзя наадрэз адмовіўся ад гэтага і застаўся з партызанамі. Не раз ён выконваў складаныя і адказныя даручэнні старэйшых баявых сяброў. У самых нечаканых месцах Валодзя расклейваў лістоўкі з заклікамі да савецкіх людзей узмацніць барацьбу супраць акупантаў і іх наймітаў.

Карнікі актыўна шукалі юнага патрыёта. І ў час аднаго з наведванняў роднай вёскі Захарнічы Валодзя быў схоплены карнікамі ў бацькоўскай хаце, а пры вобыску за печкай яны выявілі пачак лістовак. На гэты раз браўраму хлопчыку ўцячы не ўдалося.

Збітага і акрываўленага Валодзю гітлераўскія каты спачатку кінулі ў засценак, а затым, нічога ад яго не дабіўшыся, расстралялі. Пахаваны Валодзя на месцы сваёй трагічнай гібелі на паўстанку Пазнякова.

Піянеры Захарніцкай школы часта наведваюць магілу свайго мужнага земляка і беражліва даглядаюць яе. Яны прыходзяць да магілы Валодзі па той сцяжынцы, па якой ён не раз хадзіў на баявыя заданні і на якой абарвалася яго кароткае, але яркае жыццё.

Артыкул "І сёння з намі" у газете "Віцебскі рабочы". 24 лістапада 1977 г. (№ 230). С. 4

# Шпакаў Ваня

Сям'я Вані Шпакава не паспела эвакуявацца з роднага Суражскага раёна на ўсход, як Вялікая Айчынная вайна застала іх у Калінінскай вобласці.

Узімку 1941 г. сям'я была вымушана вярнуцца дадому ў вёску Канашы. На другі дзень пасля іх вяртання, акупанты арыштавалі маму Вані, жонку работніка савецкай міліцыі.

Свой першы патрыятычны ўчынак маленькі Паша здзейсніў гэтай жа зімой: сабраў, знойдзеныя ў лесе савецкія лістоўкі і прынёс іх ў вёску. Так жыхары Канашы і суседніх вёсак упершыню пасля акупацыі даведаліся праўду аб становішча на савецка-германскім фронце.

У студзені 1942 г. маці Вані ўдалося збегчы з-пад арышту. Разам з дзецьмі яна схавалася ў лесе, дзе сустрэла партызан.

Дзякуючы сваёй настойлівасці, Ваня быў прыняты ў партызанскі атрад славутага Бацькі Мінаяі нёс службу нароўні з дарослымі: адпраўляўся на разведку, выконваў даручэнні па сувязі, а таксама ўдзельнічаў у баях з праціўнікам.

Сапраўдную адвагу і мужнасць паказаў юны помсьнік разам са старшынёй атрада партызан Васілём Кашалем, абараняючы месца размяшчэння свайго атрада, куды прабраліся праціўнікі. У ходзе жорсткай перастрэлкі, каля Вані разарвалася адна з варожых мін. Хлопчыка кантузіла, і ён быў адпраўлены за лінію фронту ў савецкі тыл.

Вярнуўся герой у родную вёску ўжо пасля выгнання адтуль захопнікаў. У 1951 г. Іван Шпакаў быў прызваны ў савецкую армію і з гэтага часу назаўсёды звязаў свой лёс са службай ва Узброеных Сілах нашай краіны.



## З атрада Бацькі Мінаяа

Нарадзіўся Ваня Шпакаў у 1930 годзе ў вёсцы Канашы Суражскага раёна.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна і фашысцкія войскі набліжаліся да тэрыторыі Віцебскай вобласці, сям'я Шпакавых паспрабавала эвакуіравацца на ўсход. Але паспелі яны даехаць толькі да Калінінскай вобласці, і туды неўзабаве прыйшлі гітлераўскія захопнікі.

У снежні 1941 года па цяжкіх дарогах вайны Ваня разам з маці і сястрой вярнуліся ў сваю вёску Канашы. А на другі дзень пасля іх вяртання акупанты арыштавалі маці як жонку работніка савецкай міліцыі.

Свой першы патрыятычны ўчынак адзінаццацігадовы Ваня Шпакаў здзейсніў у снежні 1941 года. Было гэта марознай раніцай. У лесе на кустах і дрэвах Ваня заўважыў нейкія паперы. Калі ён разгледзеў іх, то зразумеў, што гэта — савецкія лістоўкі, відаць, скінутыя з самалёта. Лістовак аказалася каля дзесятка.

Ваня сабраў іх, схаваў за пазуху і прынёс у вёску. У лістоўках было надрукавана выступленне Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны І. В. Сталіна на Краснай плошчы ў дзень 24-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. Так дзякуючы хлопчыку жыхары Канашоў і навакольных вёсак, напэўна, упершыню пасля акупацыі даведаліся праўду аб становішчы на савецка-германскім фронце.

У студзені 1942 года маці ўдалося ўцячы з-пад арышту і разам з дзецьмі схавацца ў лесе.

Дзякуючы сваёй настойлівасці, Ваня быў прыняты ў партызанскі атрад праслаўленага Бацькі Мінаяя. Цяжкую партызанскую службу юны патрыёт нёс нароўні з дарослымі: накіроўваўся на варту, выконваў даручэнні па сувязі і разведцы, а таксама ўдзельнічаў у баях з карнікамі.

Аднойчы глыбокай ноччу гітлераўцам удалося тайком наблізіцца да размяшчэння атрада. Завязалася жорсткая перастрэлка паміж партызанамі і карнікамі. Нягледзячы на нечаканасць нападу, народныя мсціўцы не спалохаліся. У ліку партызан, якія адбівалі націск ворага, знаходзіўся і Ваня Шпакаў. Хутка ацаніўшы абстаноўку, ён і старшына атрада Васіль Кошалеў занялі зручную пазіцыю. І як толькі перад імі паказалася больш дзесяці ўзброеных акупантаў, адкрылі такі агонь з кулямёта і вінтоўкі, што адразу ж адправілі на той свет некалькі чужынцаў, а астатніх вымусілі адступіць.

Аднак бой на гэтым не закончыўся. Гітлераўцы пачалі моцны абстрэл партызанскай абароны з мінамётаў. Адна з варожых мін разарвалася так блізка каля Вані, што ён быў кантужаны і неўзабаве адпраўлен за лінію фронту ў савецкі тыл.

Вярнуўся Ваня ў родныя мясціны пасля выгнання захопнікаў. У 1951 годзе быў прызваны ў Савецкую Армію і з гэтага часу назаўсёды звязаў свой лёс са службай ва Узброеных Сілах нашай краіны.

Цяпер Іван Сяргеевіч Шпакаў служыць у адной з воінскіх часцей Савецкай Арміі. За заслугі перад Радзімай адзначан многімі ўрадавымі ўзнагародамі.

Артыкул "З атрада Бацькі Мімная" у газете "Віцебскі рабочы"
9 лютага 1978 г. (№ 29). С. 4

# Мармашоў Вася

Свой першы мужны ўчынак 12-гадовы Вася Мармашоў здзейсніў яшчэ ў пачатку вайны.

Салдаты Чырвонай Арміі, якія адыходзілі на ўсход і шукалі шляхі прарыву з варожага акружэння, зрабілі кароткачасовы прыпынак ў вёсцы Расна, там нарадзіўся і жыў Вася. Камандзір атрада даў важнае даручэнне юнаму смяльчаку: прабрацца у захоплены гітлераўцамі пасёлак Усмань, які знаходзіўся ў дванцаці кіламетрах ад Расна, і выведаць наяўнасць варожай ваеннай тэхнікі, месца яе размяшчэння, а таксама прыкладную колькасць фашысцкіх салдат. Вася паспяхова выканаў заданне і вярнуўся з каштоўнай інфармацыяй, дзякуючы чаму воінскай часці Чырвонай арміі ўдалося вырвацца з варожага кальца.

Такім чынам, юны партрыёт быў залічаны ў спецыяльную дыверсійную групу пад камандаваннем Ф.К. Юрчанкі, якая з кастрычніка 1942 г. здзяйсняла рэйды па тэрыторыі Міёрскага, Шаркаўшчынскага і Глыбоцкага раёнаў Віцебшчыны. Нямала небяспечных заданняў легла на плечы храбрацам з гэтай групы, якая з часам вырасла ў партызанскую брыгаду "Кастрычнік".

Юны патрыёт неаднаразова хадзіў у разведку ў размяшчэнне нямецкіх частак і гарнізонаў, здабываў партызанам патроны, зброю і прадукты, прымаў удзел у дыверсійных аперацыях, пакуль аднойчы каля вёскі Зашчэсле варожая куля не прабіла сэрца маленькага Васі.

Цела народнага мсціўца было пахавана яго таварышамі каля вёскі Гарнова. Пасля вайны астанкі героя перапахавалі ў брацкай магіле ў гарадскім пасёлку Падсвілле.

За праяўлены гераізм і мужнасць Васіль Мармашоў быў узнагароджаны медалём “Партызану Айчыннай вайны” II ступені.



## У саставе дыверсійнай групы

Свой першы мужны ўчынак, дастойны юнага ленінца, Вася Мармашоў здзейсніў яшчэ ў пачатку вайны, у свае 12 хлапечых год.

У вёсцы Расна, дзе нарадзіўся і жыў Вася, у жніўні 1941 года зрабілі кароткачасовы прыпынак воіны Чырвонай Арміі, якія адыходзілі на ўсход і шукалі шляхі прарыву з варожага акружэння. Камандзір звярнуўся за дапамогай да Васі. Яго не прыйшлося доўга ўгаворваць. Як і належыць савецкаму патрыёту, па заданню камандзіра Вася, пераадолеўшы адлегласць у 20 кіламетраў, прабраўся ў пасёлак Усмынь, які к гэтаму часу ўжо быў захоплены гітлераўцамі. Фашысцкія салдаты не звярнулі ўвагі на вясковага хлапчука. Карыстаючыся гэтым, Вася разведаў наяўнасць у пасёлку ваеннай тэхнікі гітлераўцаў, месцы яе размяшчэння і прыкладную колькасць фашысцкіх салдат. Вярнуўшыся з баявога задання, Вася перадаў камандзіру сабраныя ім звесткі. Дзякуючы яму воінскай часці Чырвонай Арміі ўдалося ноччу вырвацца з варожага кальца.

Настойлівасць і смеласць, якімі быў надзелены Вася, садзейнічалі таму, што яго залічылі ў спецыяльную дыверсійную групу пад камандаваннем Ф. К. Юрчанкі, якая з кастрычніка 1942 года рабіла рэйды па тэрыторыі Міёрскага, Шаркаўшчынскага і Глыбоцкага раёнаў Віцебшчыны. Нямала баявых спраў на рахунку ўдзельнікаў гэтай групы, якая вырасла затым у партызанскую брыгаду «Кастрычнік».

Вася Мармашоў люта ненавідзеў гітлераўскіх захопнікаў і таму заўсёды рваўся ў бой.

Партызанская разведка ўстанавіла, што ў вёску Бараўцы Глыбоцкага раёна прыбыло нейкае новае падраздзяленне гітлераўскіх ваяк, якія ахоўваюць склад з боепрыпасамі. Камандаванне рашыла знішчыць ахову і знішчыць склад. У групу для правядзення гэтай аперацыі быў уключан і Вася Мармашоў, якога старэйшыя баявыя сябры ласкава называлі «маленькім». Як і заўсёды, Вася паказаў сябе ў баі храбрым воінам. Заданне было выканана — склад узляцеў у паветра.

У сваіх успамінах аб баявых буднях былая партызанка-падрыўніца М. С. Максіменка расказвае: «Аднойчы мы ішлі на заданне, з намі быў і Вася... Падыходзячы да вёскі Зашчэсле (цяпер вёска Уражайная Глыбоцкага раёна), мы нечакана натыкнуліся на немцаў. Завязалася перастрэлка, фашысцкая куля прабіла сэрца Васі Мармашова...».

Народныя мсціўцы не пакінулі цела юнага героя на здзекі ворагам, а пахавалі яго каля вёскі Гарнова. Пасля вайны астанкі мужнага юнака былі перанесены ў брацкую магілу ў гарадскім пасёлку Падсвілле.

У краязнаўчым музеі Псуеўскай сярэдняй школы беражліва захоўваюцца матэрыялы пра Васю Мармашова, сабраныя школьнымі следапытамі. На прыкладзе яго кароткага, але гераічнага жыцця выхоўваюцца новыя пакаленні юных патрыётаў Айчыны.

Артыкул “У саставе дыверсійнай групы”
у газеце “Віцебскі рабочы”.
9 лютага 1978 г. (№ 29). С. 4

# Квяткоўскі Валодзя

Валодзя Квяткоўскі вылучаўся сярод сваіх аднагодкаў буйным целаскладам і высокім ростам. З прыходам нямецка-фашысцкіх акупантаў гэта прынесла яму шмат непрыемнасцяў: у першыя ж дні немцы двойчы затрымалі хлопчыка з мэтай адпраўкі яго на катаржныя работы ў Германію, на трэці раз Валодзю адправілі на будаўніцтва абарончых збудаванняў пад Веліж, адкуль яму ўдалося збегчы.

Аднак вяртацца было няма куды – родная вёска спалена ворагам, а жыхары сагнаныя. Адзінае месца, куды можна было падацца – гэта лес, там смелага і валявога хлопца прынялі ў партызаны.

Вельмі добра праявіў сябе юны мсцівец падчас аперацыі па мініраванні дарогі Лушчыха-Койрава 28 верасня 1943 г., па якой хадзілі нямецкія грузавыя машыны. Юнак неаднаразова хадзіў у разведку, прабіраўся да варожых пастоў і ўсталёўваў там міны.

Таксама Валодзя адважна абараняў сваіх баявых таварышаў у зацягнутым баі 31 кастрычніка 1943 г. пад Канашамі.

Пасля ўступлення атрада ў Чырвоную Армію Уладзімір Квяткоўскі сышоў на службу ў яе шэрагі, працягваючы ўдзельнічаць у баях за вызваленне роднай краіны. Шмат разоў ён быў паранены і нават страціў правую руку, але моцнае здароўе дапамогло яму выбрацца са шпіталя.

За свае баявыя заслугі ўдастоены высокай урадавай узнагароды – ордэн Айчыннай вайны II ступені (1947).

## ТВАРАМ ДА НЕБЯСПЕКІ

Валодзя Квяткоўскі сярод сваіх трынаццаці-чатырнаццацігадовых равеснікаў, якія жылі ў вёсках Смолкі і Буева былога Суражскага раёна, вылзяляўся перш за ўсё сваім высокім ростам і моцным складам цела. Аднак з прыходам нямецка-фашысцкіх акупантаў у ліпені 1941 года гэта яму прыносіла толькі непрыемнасці. У першыя ж дні Валодзя разам з дарослымі двойчы быў затрыманы гітлераўцамі з мэтай адпраўкі на катаржныя работы ў Германію. Пасля трэцяга затрымання акупанты адправілі Валодзю пад Веліж на будаўніцтва абарончых умацаванняў. Але праз некалькі дзён, рызыкуючы жыццём, ён уцёк. Яшчэ на падыходзе да роднай вёскі Валодзя ўбачыў страшэнны малюнак: фашысцкія каты ўшчэнт спалілі ўсе дамы і пабудовы, а жыхароў угналі з сабой.

У гэтым становішчы ў Валодзі заставалася адзіна правільная дарога — пайсці да партызан. І ён пайшоў.

Валодзя быў смелым і валявым хлопцам. Вось што пра яго расказвае камандзір партызанскага атрада А. А. Пагарэлаў:



«Асабліва вызначыўся Валодзя Квяткоўскі ў дзвюх аперацыях. У ноч на 28 верасня 1943 года група партызан, прайшоўшы непрыкметна паміж некалькімі гарнізонамі праціўніка, замініравала дарогу Лушчыха—Койрава. На гэтых мінах падарваліся дзве грузавыя аўтамашыны з гітлераўцамі. Было знішчана 35 фашысцкіх салдат. Начальнік разведкі атрада М. Х. Кобелеў, які знаходзіўся разам з групай мінёраў, дакладваў мне, што ў гэтай аперацыі вельмі добра праявіў сябе юны партызан Валодзя Квяткоўскі. Ён быў праваднiком у групе. Па дарозе неаднаразова хадзіў у разведку, непрыкметна падбіраўся да гітлераўскіх пастоў, а потым, калі ўстанаўліваліся міны, ахоўваў падрыўнікоў.

31 кастрычніка 1943 года ў лесе пад Канашамі, каля другой лініі абароны праціўніка, атрад вёў дзевяцігадзінны найцяжэйшы бой. То мы пераходзілі ў атаку, то акупанты. У адной з контратак Валодзя Квяткоўскі вырваўся наперад. Падбегшы з тылу да страляўшага па партызанах фашыста, ён знішчыў яго і з яшчэ не астыўшым ад страляніны аўтаматам гітлераўца вярнуўся да сваіх баявых сяброў».

Пасля злучэння атрада з Чырвонай Арміяй Уладзімір Квяткоўскі пайшоў на службу ў яе рады. Удзельнічаў у баях за вызваленне роднай Беларусі. Быў двойчы ранены. Асабліва цяжкім было другое раненне, у выніку якога ён страціў правую руку і атрымаў шмат ран на ўсім целе. Толькі моцнае здароўе Уладзіміра дапамагло яму пасля сямі доўгіх пакутлівых месяцаў выбрацца са шпіталя. Высокая ўрадавая ўзнагарода — ордэн Айчыннай вайны II ступені — знайшла героя пасля вайны, у 1947 годзе.

Цяпер Уладзімір Пятровіч Квяткоўскі жыве ў вёсцы Буева Віцебскага раёна, працуе леснiком у калгасе «Памяць Леніна».

Артыкул "Тварам да небяспекі" у газете "Віцебскі рабочы". 16 лютага 1978 г. (№ 34). С. 4

